View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Этнакультурнае выхаванне дзяцей як педагагічная з’ява

*Нацыянальная свядомасць асобы – гэта суб’ектыўнае адлюстраванне аб’ектыўнага факта прыналежнасці чалавека да той ці іншай нацыянальнай супольнасці і ўсведамленне адрозненняў да іншых народаў. Яна фарміруецца ў асобе пад непасрэдным уздзеяннем нацыянальных элементаў, нацыяльнага асяроддзя, мовы народа, яго культуры, быту, гісторыі.*

*А. А. Грымаць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Культура, як пэўнае паняцце, характарызуе як адрозненнне чалавечай жыццядзейнасці ад біялагічных формаў жыцця, так і якасную адметнасць канкрэтных праяўленняў гэтай жыццядзейнасці ў пэўныя эпохі, для розных грамадстваў, народнасцей, нацый. Разам з тым культура ўключае ў сябе прадметныя вынікі дзейнасці людзей, а таксама рэалізуемыя ў дзейнасці чалавека веды, уменні, навыкі, узровень інтэлектуальнага, маральнага і эстэтычнага развіцця, спосабы і формы зносін.

Навукоўцы разглядаюць культуру як «гістарычны ўзровень развіцця грамадства і чалавека» (С. С. Аверынцаў, А. М. Прохараў, І. С. Ожэгаў, І. Т.Фралоў), як «сукупнасць дасягненняў чалавецтва, грамадства» ( І. А. Каіраў, Ф. М. Пятроў), як «фактар развіцця творчых сіл і здольнасцей чалавека» (І. М. Кандакоў, А. М. Вішнякоў, М. М. Бязрукіх).

Комплексная разумення культуры прытрымліваецца А. П. Садохін. Ён вызначае яе як пазабіялагічна выпрацаваны (не замацаваны генетычна) і перадаваемы спосаб чалавечай дзейнасці.

Унікальным фенаменам сусветнай культуры з’яўляецца этнічная культура.

Культура любога народа ўяўляе сабой сінтэз традыцыйных і інавацыйных з’яў. У ёй адлюстроўваюцца гісторыя народа, яго гаспадарчыя веды, этнічныя нормы, светапогляд. Па зазначэнні А. П. Садохіна, этнічная культура гэта сукупнасць належачых этнасу спосабаў засваення ўмоў свайго існавання, якія накіраваны на засваенне этнаса і ўзнаўленне ўмоў яго жыццядзейнасці. Аўтар лічыць, што галоўным ў дадзеным выпадку з’яўляецца функцыянальны аспект культуры, разуменне яе як адаптыўнага механізму, які аблягчае чалавеку жыццё ў акружаючым свеце.

Менавіта ў сферы культуры знаходзяць месца вызначальныя прыкметы этнасаў. Традыцыйная культура дазваляе стварыўшаму яе народу ідэнтыфікаваць сябе як этнічную сукупнасць.

У навуковай літаратуры можна сустрэць шмат трактаванняў паняцця “этнас”. Ю. В. Брамлей разглядае этнас, як «сацыяльную сукупнасць”; Л. М. Гумілёў, як «сацыяльна – біялагічныя папуляцыі»; С. А. Аруцюнаў, як «чыста-чалавечую з’яву”.

Большасць навукоўцаў у якасці асноўных характарыстык этнасу вызначаюць:
агульнае для ўстойлівай супольнасці людзей паходжанне і гістарычны лёс, адзіныя этнічная тэрыторыя, мова, самасвядомасць, ментальнасць, культура ( В.С. Цітоў);
сукупнасць (племя, народнасць, нацыя) гістарычна слажыўшыхся на пэўнай тэрыторыі асаблівасцей мовы, культуры і псіхалагічнага складу (С. І. Ожэгаў); агульнае для пэўнай групы людзей ўтварэнне, адзіная мова, комплекс звычаяў і агульны склад жыцця ( С. М. Шырокагораў); складанае ўтварэнне, пры гэтым кожны этнас адначасова з іншымі этнасамі валодае як агульнымі ўласцівасцямі, так і спецыфічнымі рысамі, якімі вызначаецца кожны з іх ад усіх астатніх этнасаў
( А. П. Садохін)

А. П. Садохін заўважае, што на этнаўтвараючыя працэсы уздзейнічаюць разнастайныя фактары, якія могуць мець унутрыэтнічны, міжэтнічны і знешнеэтнічны характар.

На думку Ю. В. Брамлея, “ этнас утвараецца грамадскімі працэсамі і само яго развіццё таксама адзін з такіх працэсаў”. Навуковец зазначае, што этнас уяўляе сабой пэўную культурную цэласнасць і культура ў шырокім сэнсе гэтага слова забяспечвае ў грамадстве этнічную пераемнасць.

Этнічная культура праяўляецца літаральна ва ўсіх галінах жыцця этнасу: у мове, у выхаванні дзяцей, у народным строі, у побыце, у фальклоры.

Этнакультура кожнага народа мае свой унікальны пласт матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, які змяшчае магутны выхаваўчы патэнцыял для развіцця і фарміравання паўнацэннай асобы. Прызнанне прярытэту этнакультуры і агульначалавечых каштоўнасцей патрабуе пошуку новых спосабаў і магчымасцяў уключэння ў гэтую галіну падрастаючага пакалення у перыяд фарміравання асобы.

Матэрыяльная і духоўная культура знаходзяцца ў арганічным адзінстве. Яны інтэгруюцца ў адзіны тып культуры, які вызначаецца гістарычнай зменлівасцю. Трансляцыя культуры ад пакалення да пакалення ўключае засваенне назапашанага чалавецтвам вопыта, але не супадае з утылітарным аваолдваннем вынікамі папярэдняй дзейнасці. Разам з тым культура заўжды застаецца скарбонкай вопыта і каштоўнасцей.

Аналіз этнаграфічнай літаратуры дазваляе разглядаць традыцыйную духоўную культуру як «комплекс уяўленняў і правілаў, якія передаюцца ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пакалення да пакалення»; «комплекс уяўленняў пра навакольны свет і самаго чалавека ў гэтым свеце (г. зн. традыцыйны светапогляд)»; «уся сістэма вытворчых навыкаў , якія звязаны з гаспадарчым, сацыяльным і сямейным жыццём»; «розныя віды народнай творчасці; рэлігійныя вераванні, звычаі, абрады, народнае выхаванне, этыка паводзін і г. д.»

Што да традыцыйнай матэрыяльнай культуры, то гэта прадметны свет, абумоўлены бытам, гаспадарчым ладам, геаграфічнымі ўмовамі і этнакультурнымі кантактамі ў пэўных гістарычных умовах і на пэўным урыўку часу. Разам з тым матэрыяльная культура выступае як адзін з важных сродкаў выяўлення этнічнай адметнасці таго ці іншага народу.

Неабходна адзначыць, што ў апошнія дзесяцігоддзі назіраецца шырокі грамадскі інтарэс да этнічнай культуры як ў нашай краіне, так і ва ўсіх народаў Еўропы. Праблема сцвярджэння сваёй культурнай ідэнтычнасці і непаўторнасці становіцца вызначальнай ў час глабалізацыі і татальнай універсалізацыя жыцця.

Па меркаванні Г. М. Волкава, ступень культурнасці народаў можна вызначыць па тым, наколькі актыўна яны супрацьстаяць працэсу знікнення каштоўных народных традыцый, наколькі накіравана яны шукаюць спосабы захавання і адраджэння страчаных скарбаў.

У сувязі з пад'ёмам нацыянальнай самасвядомасці, імкненнем народа да этнічнай і этнакультурнай самаідэнціфікацыі праблема этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца адной з вызначальных.

**Этнакультурнае выхаванне** – гэта новая катэгорыя, якая непасрэдна звязана з навукай этналогіяй. У этналогіі цэнтральнымі паняццямі з'яўляецца вывучэнне народаў-этнасаў, іх паходжанне і заканамернасці развіцця, характар жыццядзейнасці, культурныя традыцыі і межэтнічныя ўзаемасувязі.

У аснове этнакультурнага выхавання дзяцей ляжаць адаптаваныя на дашкольны ўзрост вядучыя ідэі этналогіі: этнас, яго ўтварэнне і заканамернасці развіцця, характар жыццядзейнасці этнаса, культурныя традыцыі.

Неабходна адзначыць, што ў навукова-педагагічнай літаратуры праблема выхаваўчага патэнцыяла этнакультуры разглядаецца з розных пазіцый. У даследаваннях Г. Н. Арловай, Г. М. Воўкава, Т. С. Камаровай, Т. А. Купач, А. Ю. Лозкі, М. Д. Маханёвай, Т. Я. Шпікалавай праблема трансляцыі культурных форм у працэсе выхавання і навучання трактуецца ў кантэксце засваення дзецьмі ўжо склаўшагася народнага вопыту.

У навуковых працах Б. М. Бім-Бада, Я. В. Бандарэўскай, А. П. Валіцкай, В. П. Зінчанка, У. А. Каракоўскага, А. У. Мудрыка, Б. Т. Ліхачова В. І. Слабодчыкава, Н. Я. Шчурковай і інш. адукацыя разглядаецца як асаблівая сфера культуры. Гэтая сфера звязана не толькі з засваеннем падрастаючым пакаленнем пэўных культурных нормаў і каштоўнасцей, але і з ўключэннем дзяцей у дзейнасць па пераўтварэнню сацыякультурнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асяроддзя. Дзіця ў гэтым выпадку выступае як суб'ект культуратворчай дзейнасці.

У расійскім Праекце развіваючай дашкольнай адукацыі ( В. Т. Кудраўцаў), які распрацаваны па мадэлі Д. Б. Эльконіна – В.В. Давыдава, культуратворчая дзейнасць дзяцінства з'яўляецца вызначальнай. Яна разглядаецца як жыццё дзіцяці ў сацыяльным акружэнні. Пры гэтым тая культурна-гістарычная прастора, якая акружае дзяцей дашкольнага ўзросту, ўплывае на фарміраванне іх каштоўнасных прыярытэтаў.

З культуралагічных і этналагічных пазіцый разглядаюць уключэнне дзіцяці ў культуратворчую дзейнасць Г. М. Барташэвіч, А. А. Грымаць, М. Я. Данілеўскі, В. Б. Уласава, І. А. Ільін, С. В. Лур'е, Э. С. Маркаран , К. У. Чыстоў і інш. Па меркаванні даследчыкаў, адметнасць гэтай культуратворчай дзейнасці складае сумленнасная каштоўнасная дамінанта карціны свету і вобраза жыцця.

Псіхалагічны аспект этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту разглядаецца ў навуковых работах В. В. Зяньхоўскага, В. П. Зінчанка, С. Л. Рубінштэйна, Т. А. Фларэнскай і інш. У іх адзначаецца, што ў гістарычна зменлівай сацыякультунай рэчаіснасці культурная пераемнасць непасрэдна звязана з маральным самавызначэннем падрастаючага дзіцяці, якое падмацоўваецца асобасна-значымай для яго асобы акаляючай рэчаіснасцю.

У адпаведнасці з даследаваннямі Л. І. Бажовіч, Л. С. Выгоцкага, А. М. Лявонцьва, С. Л. Рубінштэйна, Д. Б. Эльконіна і інш, этнакультура як асноўная частка агульначалавечай культуры, засвайваецца асобай у актыўнай ствараючай дзейнасці.

Вызначальнаю ролю ў этнакультурным выхаванні адыгрывае яго аксіялагічная састаўляючая, якая адлюстроўваецца у такіх аксіялагічных функцыях, як: трансляцыя культуры, захаванне адметнасці нацыянальных традыцый, сацыялізацыя дзіцяці шляхам перадачы маральных нормаў, маральных каштоўнасцей.

Адсюль, **этнакультурнае выхаванне – гэта мэтанакіраваны працэс фарміравання ў дзіцяці нацыянальна-культурнага аблічча, на аснове прыняцця ім каштоўнаснага ідэалу роднай культуры; станаўленне каштоўнасных арыенціраў дзіцяці і спосабаў яго ўзаемадзеяння з сацыякультурным акружэннем.**

Прыняцце дзіцём каштоўнаснага ідэалу роднай культуры як асобасна значнага ажыццяўляецца ў адпаведнасці з мэтавай устаноўкай характэрнай для тэорыі культураадпаведнага выхавання ( Б. М. Бім-Бад, І. Д. Лушнікаў, М. Д. Нікандраў, Н. Е. Шчуркова, Я. А. Ямбург).

Разам з тым этнакультурнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту разумеецца як мэтанакіраваны працэс, які ўлічвае асобасную значнасць для кожнага дзіцяці засвоеных ім культурных мадэляў ( канкрэтных этычных норм, звестак пра культуру), запатрабаванасць гэтых мадэляў ва ўласным самастойным вырашэнні жыццёвых сітуацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Этнакультурнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца сістэмаўтвараючым звяном адукацыйнага працэсу. Яно заарыентавана на фарміраванне сістэмнай ідэнціфікацыі і фарміраванне інтэрыярызацыі этнакультурных і агульначалавечых каштоўнасцей.

***Канцэптуальнай асновай выбару мэты і зместа этнакультурнага выхавання выступае ідэя выхавання дзіцяці як асобы, якая ўключана ў айчынную культурную традыцыю ( С. І. Гесен, І. А. Ільін, К. Д. Ушынскі).***

***Структура этнакультурнага выхавання*** ўяўляе сабой адзінства і ўзаемасувязь каштоўнасна-арыентацыйнага, рэфлексіўнага і дзейнаснага кампанентаў. Гэтыя кампаненты забяспечваюць здольнасць дзяцей да асобаснага выбара маральных прыярытэтаў у адносінах з сацыякультурным акружэннем.

Выбар каштоўнасных арыенціраў, якія вызначаюць адносіны дзіцяці да навакольнага асяроддзя, непасрэдна звязаны з каштоўнасна-арыентацыйным кампанентам. Асэнсаванне дзецьмі свайго вопыту адносін і пабудова ўласнай індывідуальнай карціны свету – з рэфлексіўным. Дзейнасны кампанент вызначае пражыванне дзіцём уласнай індывідуальнай карціны свету ў актыўным пераўтварэнні навакольнай рэчаіснасці .

***Мэтаю этнакультурнага выхавання з'яўляецца нацыянальна-культурнае аблічча асобы дашкольніка, на аснове прыняцця ім каштоўнаснага ідэалу роднай культуры.***

Пры гэтым маральнае самавызначэнне дзіцяці, якое расце ў гістарычна зменлівай сацыякультурнай рэчаіснасці, ажыццяўляецца шляхам уласнага асобасна-значнага выбару гэтым дзіцём пэўных каштоўнасных арыенціраў і спосабаў узаемадзеяння з сацыякультурным акружэннем.

***Асноўнымі задачамі этнакультурнага выхавання выступаюць:***

***1. Ідэнціфікацыя дзяцей дашкольнага ўзросту ў этнакультурным акружэнні і авалодванне імі агульначалавечымі каштоўнасцямі ( пры умове авалодвання роднай( беларускай) мовай).***

Па меркаванні айчынных педагогаў А. Н. Арловай, А. А. Грымаця, А. Ю. Лозкі, Н. С. Старжынскай узмацненню этнізацыі адукацыі спрыяе узрастанне ролі роднай мовы, прытрымліванне ў выхаванні мэтаў народнай педагогікі. У нашай краіне распрацавана дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў. У ёй падкрэсліваецца неабходнасць забяспячэння абавязковага паслядоўнага ўкаранення беларускай мовы ў выхаваўча-адукацыйны працэс як беларускамоўных дашкольных устаноў, так і дашкольных устаноў з рускім моўным рэжымам. Асаблівае значэнне такі накірунак работы набывае ў сувязі з тым, што навучанне беларускай мове ў рэспубліцы ажыццяўляецца ў спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі, якую можна ахарактарызаваць як руска-беларускае блізкароднаснае двухмоўе, дзе беларуская мова паступова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пачынае займаць месца роднай мовы і ў поўнай ступені становіцца не толькі мовай памяці і этнічнай ідэнціфікацыі, а на самой справе мовай душы.

Культурная ідэнціфікацыя тут разглядаецца як запатрабаванасць культурных здольнасцей і ўласцівасцей асобы, актуалізацыя пачуцця прыналежнасці дзіцяці да пэўнай культуры і аказанне яму дапамогі ў набыцці рысаў чалавека культуры (Я. В. Бандарэўская)

*Менавіта беларуская мова вызначае сабой адначасова і змест, і сродкі духоўнага развіцця дзіцяці, яго дачынення да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.*

Узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць культуры і роднай мовы звязана з тым, што на роднай мове ажыццяўляецца першапачатковае індывідуальнае і сацыяльнае развіццё дзіцяці, фарміраванне яго асобы. Родная мова дапамагае дзіцяці ўвайсці ў навакольны свет, стаць сапраўдным грамадзянінам пэўнай культурнай прасторы. Вывучэнне мовы як сродка зносін узаемазвязана з адначасовым вывучэннем культуры таго народа, які ажыццяўляе зносіны на гэтай мове.

***2. Арыентацыя дзяцей дашкольнага ўзросту на традыцыйныя духоўныя каштоўнасці, дзе вызначальным з'яўляюцца суадносіны і ўзаемадзеянне агульначалавечага і этнакультурнага, выхаванне дзіцяці як асобы, якая ўключана ў айчынную культурную традыцыю.***

Фарміраванне першаасновы этнакультурнага выхавання – гэта выхаванне дзяцей на аснове культурацэнрыстскай парадыгмы, якая будуецца на прынцыпе адзінства і ўзаемадзеяння беларускага і агульнасусветнага, у традыцыях айчыннай народнай культуры і мэжэтнічных узаемасувязяў. Гэта станаўленне ў дзяцей асэнсавана правільных адносін непасрэдна да самаго навакольнага свету ва ўсім яго шматаблiччы; да людзей, якія ствараюць, на аснове багаццяў акружаючага свету, матэрыяльныя ці духоўныя каштоўнасці. Гэта адносіны дзіцяці да сябе як часткі рукатворнага свету і свету прыроды.

Этнакультурнае выхаванне – гэта выхаванне кожнага дзіцяці ва ўзаемапаразуменні, сяброўстве паміж народамі; фарміраванне ў яго думкі наконт таго, што яго ўласныя здольнасці накіраваны на карысць іншым людзям, свайму народу.

***3. Педагагічная падтрымка дзяцей дашкольнага ўзросту ў іх нацыянальна- культурным, духоўна-маральным самавызначэнні .***

Нацыянальна-культурнае, духоўна-маральнае самавызначэнне дзяцей дашкольнага ўзросту звязана з іх дачыненнем да айчыннай культурнай традыцыі, якая непасрэдна звязана з культурааховываючай (В. В. Абраменкава) і культуратворчай (Ул. Т. Кудраўцаў) функцыямі дзяцінства. Адметнасць дачынення дзіцяці да айчыннай культурнай традыцыі вызначаецца перавагай эмацыяльнай сферы ў станаўленні каштоўнасных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

арыентацый дашкольніка, вобразна-дзейнаснай прадстаўленасцю яго карціны свету,

***4. Кіраванне станаўленнем адносін дзяцей дашкольнага ўзросту з сацыякультурным акружэннем праз пераўтварэнне асяроддзя адукацыйнай установы ў выхаваўчую прастору.***

Вывучэнне канцэпцыі, дзяржаўных стандартаў і праграм дашкольнай адукацыі паказала, што асяроддзе дашкольнай адукацыйнай установы мае дастатковыя магчымасці для спрыяльнага дачынення дзяцей да айчыннай культурнай традыцыі. Рэалізацыя гэтага патэнцыяла арыентавана на выкарыстанне гульні, актыўнае творчае ўспрыманне казак, прадуктыўныя віды дзейнасці. Ул. Т. Кудраўцаў адзначае, што ў індывідуальным развіцці сучаснага дзіцяці казка істотна дапаўняе гульню, пашырае перспектыву засваення дзіцём сферы “ незвычайнага”, уводзіць яго ў мэтафарарызаваны свет яшчэ не рэалізаваных чалавечых магчымасцей і задумаў, дапамагае скласці сваю самабытную дзіцячую карціну свету, сфарміраваць спецыфічную сістэму поглядаў на універсальныя прынцыпы пабудовы і развіцця рэчаў.

***Задачы этнакультурнага выхавання улічваюць самацэннасць кожнага перыяду дзяцінства. Яны вызначаюць інварыятны змест этнакультурнай адукацыі дашкольнікаў і яго рэалізацыі, якая забяспечвае якасныя пазітыўныя зрухі, задавальненне індывідуальных і ўзроставых патрэб дзіцяці ва ўмовах дашкольнай установы і сям'і.***

***Спецыфіка этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту абумоўлена***:

- асаблівасцямі педагагічнага працэсу ў дашкольных (рускамоўных і беларускамоўных) адукацыйных установах;
- сацыяльнай і сацыялінгвістычнай сітуацыяй развіцця дзяцінства ў сучаснай Беларусі

і заключаецца ў тым, што гэты працэс рэалізуецца ў логіцы педагагічнай падтрымкі дзіцяці ў яго нацыянальна-культурным, духоўна-маральным самавызначэнні.

**Прынцыпамі этнакультурнага выхавання з'яўляюцца:**

- ***Прынцып культураадпаведнасці выхавання***.

Апора ў выхаваўчым працэсе на нацыянальныя традыцыі народа, яго культуру, нацыянальна- этнічную абраднасць, звычаі.

- ***Прынцып гуманістычнай арыентацыі выхавання***.

Дзіця – галоўная каштоўнасць ў сістэме чалавечых адносін, вызначальнай нормай якіх з'яўляецца гуманасць. Гэты прынцып патрабуе паважлівых адносін да кожнага чалавека, паважлівых адносін паміж педагогамі і дзецьмі. Па меркаванні Ш. Аманашвілі, сапраўды гуманнай педагогікай з'яўляецца тая, якая мае магчымасць дачыніць дзіця да працэсу стварэння самога сябе.

- ***Прынцып асобаснага падыходу ў выхаванні***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Развіваючаяся асоба дзіцяці найвышэйшая сацыяльная каштоўнасць. Асобасны падыход патрабуе накіраванасці выхавання на захаванне і развіццё самабытнасці дзіцяці, на падтрымку працэсаў яго самаразвіцця і самавыхавання.

- ***Прынцып выхоўваючага культурнага асяроддзя***.

Гэты прынцып прадугледжвае выкарыстанне магчымасцей культурнага патэнцыялу ўнутранага і знешнега асяроддзя дашкольнай установы ў развіцці асобы дзіцяці.

- ***Прынцып суб'ектнасці ў выхаванні***.

Суб'ектнасць выхавання непасрэдна звязана з садзейніцтвам педагога развіццю ў дзіцяці здольнасці быць суб'ектам уласных паводзін, дзейнасці і ў выніку свайго жыцця.

***Змест этнакультурнага выхавання*** ўключае ***перадачу этналагічных ведаў***, на аснове якіх ***складваюцца ўяўленні***, і, с узнікненнем пэўнага матыва, ***трансфармацыю гэтых ведаў у адносіны***, якія ў сваю чаргу фарміруюць пачуццё прывязанасці да роднага кутка, пачуццё любві да роднага краю, да любай Радзімы, пачуццё патрыятызму. ***Веды з'яўляюцца абавязковым кампанентам працэса фарміравання асноў этналагічнай культуры, а адносіны – выніковым прадуктам.*** Пры гэтым, змест этнакультурнага выхавання грунтуецца на ўласны вопыт адносін дзіцяці з рознымі бакамі навакольнай рэчаіснасці. ***Авалодванне, на аснове сапраўды этналагічных ведаў, устойлівымі культурнымі нормамі, усведамленне пэўных каштоўнасцей фарміруе асэнсаваны характар адносін, дае пачатак этналагічнай свядомасці і спрыяе ўключэнню дзіцяці ў дзейнасць па творчаму пераўтварэнню сацыякультурнага асяроддзя.***

На аснове пэўных каштоўнасных арыенціраў ў дзіцяці адбываецца фарміраванне маральна-сэнсавай дамінанты карціны свету , а затым праяўленне гэтай карціны ў жыццядзейнасці як аднаго дзіцяці, так і сукупнасці дзяцей і дарослых.

***Рэалізацыі этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту спрыяе этналагічны матэрыял, які адпавядае тром структурным накірункам; народазнаўства, краязнаўства, народнае мастацтва.***

***Першы накірунак*** уключае спаціжэнне дзецьмі роднай мовы, народнага календара; быта беларусаў і пэўнага ладу іх жыцця; авалодванне народнымі звычаямі, абрадамі, традыцыямі, народным этыкетам.

Беларуская мова з'яўляецца вызначальным элементам фарміравання асобы дзіцяці як прадстаўніка пэўнага этнасу, спрыяе этнакультурнаму выхаванню выхаванцаў. Разам з засваеннем мовы вядзецца работа па засваенні дзецьмі духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей этнічнай культуры. Гэта перш за ўсё тычыцца авалодванне дзецьмі розных узростаў элементарнай этнічнай гісторыі; іх арыенціроўкі ў этнічных асаблівасцях беларускага народа, разуменні важнасці месца і ролі беларускага народа ў гістарычным развіцці чалавецтва; раўнапраўнасці розных культур.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Зместам другога накірунка*** выступае садзейніцтва фарміраванню ў дзяцей дашкольнага ўзросту пэўных уяўленняў аб прыродзе Беларусі, памятніках  культуры і архітэктуры; іх актыўны ўдзел у культуратворчай дзейнасці.

***Трэці накірунак*** уключае садзейніцтва станаўленню пэўных адносін дзяцей да народнага мастацтва беларусаў, народнай музыкі, народнага тэатру, вусна-паэтычнай народнай творчасці, іх уласная мастацкатворчая дзейнасць.

Аптымізацыя station станоўчай  рэалізацыі дачынення дзяцей да айчыннай культурнай традыцыі, фарміравання  нацыянальна-культурнага аблічча, на аснове прыняцця імі каштоўнаснага ідэалу роднай культуры забяспечваецца выкарыстаннем ***сістэмы метадаў выхавання***.  Метад выхавання – гэта мадэль арганізацыі дзейнасці педагога і дзіцяці. Яго асноўнай мэтай з'яўляецца фарміраванне ў дзіцяці каштоўнасных адносін да свету і да самога сябе.

П. І. Підкасісты вызначае тры метады выхавання стратэгічнага плану, якія , на наш погляд, з'яўляюцца вызначальнымі і ў этнакультурным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту.  ***Гэта – метад арганізацыі выхоўваючага асяроддзя, метад арганізацыі выхоўваючай дзейнасці, г.зн. узаемадзеяння дзяцей з асяроддзем, метад арганізацыі ўсведамлення  дзіцём разгортваючагася перад ім жыцця***. Тры гэтыя метады накіраваны на станаўленне асобы дашкольніка, у працэсе якога педагог спрыяе ўспрыманню дзіцём навакольнага света; дапамагае яму асэнсаваць гэты свет; ініцыіруе стварэнне свету па-за і ўнутры асобаснай структуры дзіцяці.

П. І. Підкасісты адзначае, што ўсе гэтыя метады  рэалізуюцца адначасова, у кожным асобным акце жыцця дзіцяці і падкрэслівае, што ў ракурсе фактарнага разгляду яны ўсе адносяцца да аднаго метада выхавання – педагагічная арганізацыя ўзаемадзеяння з акружаючым сацыякультурным асяроддзем. Па меркаванні навукоўца, арганізаваць выхоўваючую дзейнасць – гэта значыць прыцягнуць выхаванцаў да  разнастайнасці ўсіх відаў дзейнасці, прыдаўшы пры гэтым усім відам дзейнасці сацыяльна-каштоўнасныя рысы.

У большасці выпадкаў рэальны выбар дзяцей ў сацыкультурным акружэнні абумоўлены не столькі яго насычанасцю пазітыўным зместам, колькі асобаснай значнасцю для дзіцяці тых ці іншых элементаў сацыякультурнага асяроддзя.

Па меркаванні даследчыкаў, калі ў дашкольнай адукацыйнай установе парушаецца мера суадносін паміж гульнявой жыццядзейнасцю, актыўным творчым успрыманнем казак, прадуктыўнай дзейнасцю і мерапрыемствамі пазнавальнай накіраванасці, то пазітыўная дынаміка працэса дачынення дзяцей да айчыннай культурнай традыцыі паступова згасае, паколькі ў выхаванцаў адносіны асобаснай значнасці узнікаюць у большай ступені  ў "сферы гульні" і "сферы казкі" (А. Я. Краўцова,  Ул. Т. Кудраўцаў, А. Я. Сапагова).

Выхаваўчая работа з дзецьмі павінна быць арганізавана такім чынам, каб у адной справе,  у адным індывідуальным акце паводзін дзіцяці аб'ядналіся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

розум, эмоцыі, дзеянне як формы выражэння яго адносін да каштоўнаснага аб'екту света.

**Вызначальнымі сродкамі этнакультурнага выхавання** дзяцей дашкольнага ўзросту выступаюць:

- родная прырода;
- вусна-паэтычная творчасць , элементарная этнічная гісторыя;
- прадметы побыту і народны строй;
- народнае мастацтва;
- народны календар;

**Родная прырода –** гэта азёры і рэкі, бары і балоты, ўзгоркі і раўніны . Гэта – усё тое, што акаляе чалавека ад самага нараджэння. Менавіта родныя краявіды выхоўваюць паэзію душы дзіцяці дашкольнага ўзросту, прывучваюць яго жыць ў згодзе і ладзе з прыродным наваколлем.

**Вусна-паэтычная творчасць і творы беларускай мастацкай літаратуры** – з'яўляюцца дзейсным сродкам самавыяўлення, самаўсведамлення асобы дзіцяці. Самае першае і самае найглыбейшае самавыяўленне народнай душы адлюстравана ў мове вуснай народнай творчасці. І гэта натуральна, бо менавіта фальклор, па сутнасці, з'яўляецца асноватворнай формай праяўлення духоўнасці.

Каларытныя словы і выразы, трапныя выслоўі народных гаворак у паэтычных вобразах растлумачваюць дзіцяці жыццё грамадства і прыроды; свет чалавечых пачуццяў, узбагачаюць эмоцыі; развіваюць уяўленні і даюць цудоўныя ўзоры роднай мовы, якія здзіўляюць сваёй прастатой, арыгінальнасцю, паэтычнасцю і мілагучнасцю.

Менавіта праз фальклор адбываецца ўключэнне дзіцяці ў айчынную духоўную традыцыю. У фальклоры ўтрымліваецца сацыяльны вопыт нацыі, які перадаецца ад пакалення да пакалення праз вуснае паэтычнае слова. Азнаямленне дзяцей з творамі фальклору ўплывае на станаўленне іх сумленнаснай каштоўнаснай дамінанты карціны свету і вобраза жыцця.

Элементарная этнічная гісторыя ўключае тэксты, сімвалізуючыя сумленнасныя каштоўнасныя адносіны да навакольнага свету.

У апавядальных жанрах беларускага фальклору і мастацкай літаратуры адлюстроўваюцца асаблівасці быту і светапогляду нашых продкаў і сучаснікаў, іх грамадскія і сямейныя адносіны, а таксама асобныя гістарычныя падзеі.

Па меркаванні Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікава, казачны эпас беларусаў вызначаецца багатай вобразнай сістэмай, глыбокім зместам, арыгінальным сюжэтна-тэматычным складам. Беларускія народныя казкі традыцыйна падзяляюцца на казкі пра жывёл, чарадзейныя і бытавыя. У станоўчых казачных вобразах ўвасабляюцца народныя ідэалы: казачныя героі выступаюць абаронцамі пакрыўджаных. Яны дужыя, смелыя, разумныя, справядлівыя. У вобразах асілкаў паказваецца непераможнасць народнага духу, спадзяванне чалавека ў лепшае будучае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як адзначае К. П. Кабашнікаў, беларускія народныя казкі маюць шмат агульных рыс з казкамі іншых народаў свету, у першую чаргу ўсходніх славян. Агульныя вытокі ўсходнеславянскага фальклору, падобныя сюжэты і вобразы не прывялі да стварэння ўсеагульнага фальклорнага адзінства. Менавіта ў фальклоры інтэрнацыянальнае (усеагульнае) не выключае, а наадварот, захоўвае нацыянальнае, індывідуальнае. У беларускіх казках акрэсліваюцца нацыянальныя традыцыі, адлюстроўваецца беларускі быт і акаляючы навакольны свет.

Казачны эпас нашага народу, сярод якога беларускія народныя казкі пра жывёл лічацца жамчужынамі ўсяго ўсходнеславянскага эпасу, з'яўляецца буйнейшым набыткам нацыянальнай духоўнай культуры, які і сёння захоўвае сваё эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

Захавальнікамі гістарычнай памяці народа выступаюць легенды і паданні.

Легенды распавядаюць пра розныя падзеі і з'явы, у іх часам апісваюцца амаль неверагодныя здарэнні, паказваюцца незвычайныя героі і іх дзівосныя ўчынкі і прыгоды і, разам з тым, у гэтых фальклорных творах акрэсліваюцца пэўныя маральна-этычныя нормы і сацыяльныя ідэалы: добрасумленнае стаўленне чалавека да працы, справядлівыя і добразычлівыя адносіны паміж людзьмі. Легенды акрэсліваюць многія маральна-этычныя нормы паводзін у грамадстве, якія патрабуюць ад людзей сумленнасці, праўдзівасці, працавітасці і многіх іншых якасцей, якія адносяцца да агульначалавечых каштоўнасцей.

Што да паданняў, то яны пазбаўлены фантастычнага, чароўнага элемента. Паданні скіраваны ў мінулае, асновай іх сюжэтаў звычайна служаць гістарычныя падзеі.

Уключэнне беларускіх народных казак, легенд і паданняў у кола дзіцячага чытання дае магчымасць дзіцяці дакрануцца да гістарычнай памяці народа , да крыніц этнаграфіі і гісторыі роднага краю, адчуць свае духоўныя карані.

**Прадметы побыту** – расказваюць пра штодзённае жыццё беларусаў, пра абсталяванне і начыненне беларускай хаты. Праз гэтыя рэчы дашкольнікі атрымліваюць каштоўную інфармацыю пра нашу гістарычную мінуўшчыну, пра тое, як жыў чалавек, чым ён жыў.

**Народны строй беларусаў** – адлюстроўвае пэўныя традыцыі іх жыцця і этыкет. Дэкаратыўнае ўбранства народнага касцюма, яго колер, колькасць уваходзячых у яго кампанентаў сведчаць аб прыналежнасці касцюма, месцы яго ўжывання, адпаведнасці касцюма пэўнаму геаграфічнаму рэгіёну. Азнаямленне дашкольнікаў з народным строем выхоўвае іх эстэтычны густ, павагу да чалавека працы, уплывае на станаўленне пазітыўных адносін да беларускага касцюма, фарміруе ў іх нацыянальны імідж..

**Народнае мастацтва –** адлюстроўвае самабытнасць жыцця народа, яго ідэалы і погляды. Яно з'яўляецца дзейсным сродкам вывучэння этналогіі і гісторыі роднага краю. Першыя веды аб нацыянальнай гісторыі і культуры дашкольнік набывае менавіта праз творы народнага мастацтва. Яны з'яўляюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

першай прыступкай уваходжання дзіцяці ў цудоўны свет мастацкіх вобразаў, дачынення яго да народных традыцый, фарміравання ў яго нацыянальнай свядомасці.

**Народны календар –** упарадкаваны гадавы рытм працоўнага і духоўнага жыцця чалавека. Як частка прыроды чалавек ўзгадняе з ёй працоўны і духоўны лад свайго жыцця. Прытрымліванне ў выхаванні дзіцяці народнага календара беларусаў робіць яго жыццё адаптаваным да прыродна-экалагічных умоў акружаючай рэчаіснасці, набліжае да шматвяковай практыкі ўключэння ў адзіную касмічную сістэму дэтэрмінатыўных узаемасувязей.

Працэс станаўлення ў дзіцяці яго каштоўнасных арыенціраў і спосабаў ўзаемадзеяння з сацыякультурным акружэннем ажыццяўляецца больш эфектыўна з дапамогай такіх традыцыйных **формаў,** як:

- гульня-драматызацыя;
- сеансы актывізуючых зносін на этналагічныя тэмы;
- расказванне народных казак, легенд і паданняў і іх актыўнае творчае ўспрыманне;
- экскурсіі ў прыроду;
- экскурсіі ў краязнаўчы музей, мастацкі музей;
- маляванне, аплікацыя, лепка;
- канструяванне і мастацкая праца;
- музычныя заняткі;
- народныя святы.

**Пазітыўны патэнцыял гульні** абумоўлены наяўнасцю пэўных культурных мадэляў і стыляў жыццядзейнасці для гульнявых персанажаў, з дапамогай якіх дзіця выражае свае ўласныя пачуцці, эмоцыі, перажыванні.

**Што да казкі**, то з яе дапамогай адбываецца назапашванне дзіцём агульначалавечага творчага вопыту . Па сцвярджэнні Ул. Т. Кудраўцава, гульня і казка аб'яднаны агульным гістарычным паходжаннем, якім абавязаны культава – рытуальнай практыцы. Даследчык адзначае, што ў індывідуальным развіцці сучаснага дзіцяці казка істотна дапаўняе гульню, дапамагае скласці сваю самабытную дзіцячую карціну свету, сфарміраваць спецыфічную сістэму поглядаў на ўніверсальныя прынцыпы пабудовы і развіцця рэчаіснасці. Казка дапамагае дзіцяці назапасіць творчы вопыт агульначалавечага жыцця, што з'яўляецца неабходнай умовай актуалізацыі культуратворчай функцыі дзяцінства.

**Сцэнарыі актывізуючых зносін** выконваюць важную ролю ў наладжванні кантакта, узаемадзеяння дзяцей паміж сабой. Этналагічны змест зносін аказвае ўплыў на развіццё мастацкага ўспрымання навакольнага свету, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці дашкольнікаў.

**Прадуктыўныя віды дзейнасці** фарміруюць ў дзіцяці, развітую культуру дзеянняў, якая грунтуецца на ўсвядомленай ( У.А. Запарожац) і жыватворнай( Ул. Т. Кудраўцаў) маторыцы, якая звязана з працэсам творчага ўяўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Народныя святы**, як адлюстраванне народнай традыцыі, акумулююць народныя звычаі і абрады і тым самым выхоўваюць дзіця шляхам прыняцця ім каштоўнаснага ідэалу роднай культуры.

Вынікамі мэтанакіраванага працэсу фарміравання ў дзіцяці нацыянальна-культурнага аблічча, на аснове прыняцця ім каштоўнаснага ідэалу роднай культуры з'яўляецца станаўленне яго каштоўнасных арыенціраў і спосабаў ўзаемадзеяння з сацыякультурным акружэннем, усведамленне дзіцём прыярытэту духоўна-маральнай каштоўнасці прадметаў і з'яў акружаючай прасторы, прыняцце гэтага прыярытэту ў жыццёвай практыцы. Вызначальную ролю ў гэтай справе выконвае стварэнне выхоўваючага культурна-развіваючага асяроддзя. Яго кампанентамі з'яўляецца не толькі пэўны этнаграфічны матэрыял, але і ўсё тое, што ўтварае этнакультурны змест розных відаў дзейнасці дзіцяці дашкольнага ўзросту.

Літаратура


1. Арлова Г.Н. Беларуская народная педагогіка / Г.Н. Арлова . Беларуская народная педагогіка. – Мінск., 1993.
2. Бороздина О.С. Из опыта работы по приобщению детей к традиционной народной культуре / О.С. Бороздина // Начальная школа.–1994.- № 10. – С. 17-19.
3. Бороздина О.С. Школа народной культуры / О.С. Бороздина // Искусство в школе. – 1995.-№ 4.–С.18– 22.
4. Бороздина О.С. Воспитание ребенка в контексте приобщения его к отечественной культурной традиции / О.С. Бороздина // Духовно-нравственное воспитание студентов и школьников. Сборник научных трудов / Под редакцией д.п.н., проф. Ф.И. Кевля. – Вологда: «Русь», 2006. – 154 с. - С. 83 – 87.
5. Бромлей Ю.В. Очерки теории этноса / Ю.В. Бромлей. Очерки теории этноса. М., 1983.
6. Грымаць А.А. Народная педагогіка беларусаў./ А.А. Грымаць. Народная педагогіка белорусаў.— Мінск., 1999.
7. Гумилев Л.Н. Этногенез и биосфера Земли / Л.Н. Гумилев. Этногенез и биосфера Земли. Л., 1989.
8. Кабашнікаў К.П., Барташэвіч Г.А. Сустрэча з казкай. / К.П. Кабашнікаў , Г.А. Барташэвіч . Сустрэча з казкай. Мінск., 1984.
9. Кудрявцев В.Т. Іnновационное дошкольное образование: опыт, проблемы и стратегия развития / В.Т. Кудрявцев // Дошкольное воспитание. – 1998.-№11.– С.65– 70.
10. Лозка А. Ю. Народная спадчына – дашкольнікам./ А. Ю.Лозка. Нарродная спадчына – дашкольнікам. – Мінск., 1998.
11. Пидкасисты П.І. Педагогика. / П. І. Пидкасисты . Педагогика. – М., 2005.
12. Садохин А.П., Грушевицкая Т.Г. Этнология / А.П. Садохин., Т.Г. Грушевицкая. Этнология . М., 2000.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

13. Старжынская Н.С. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў./ Н. С. Старжынская. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў.— Мінск. Тэхналогія, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ